# Гісторыя

А. Б. ЖАЙВАРОНАК

## ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА КАМСАМОЛАМ БЕЛАРУСІ (1933 — чэрвень 1941)

Работа камсамольскіх арганізацый Беларусі ў передваенныя гады была накіравана на вырашэнне важнейшых народнагаспадарчых задач, павышэнне свядомасці і палітычнай актыўнасці моладзі.

У верасні 1933 года ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб рабоце камсамола, партыйным кіраўніцтве і дапамозе камсамолу»[1], у якой адзначалася, што камітэты ЛКСМБ не разгарнулі па-сапраўднаму работу па палітычнаму ўмацаванню сваіх радоў, паляпшэнню іх арганізацыйнай структуры. Партыйным арганізацыям прапаноўвалася накіраваць на важнейшыя ўчасткі работы камсамола камуністаў, якія знаходзяцца таксама ў камсамоле (да 1936 года камуністы ва ўзросце да 23 год з'яўляліся і членамі ЛКСМБ), сістэматычна склікаць спецыяльныя нарады камуністаў, якія працуюць у камсамоле, заслухоўваць і абмяркоўваць на бюро раённых і гарадскіх камітэтаў партыі, парткомаў і партячэек работу камуністаў, камсамольскіх важакоў, штомесячна праводзіць нарады сакратароў партыйных ячэек і камсамольскага актыву па асноўных пытаннях палітычнага і гаспадарчага будаўніцтва. Было вырашана таксама ўмацаваць камсамольскія органы, накіраваць на работу ў цэнтральны камітэт, гарадскія і раённыя камітэты камсамола 100 камуністаў з саставу партыйнага і гаспадарчага актыву рэспублікі.

Гэтыя рашэнні абмяркоўваліся на пленумах раённых і гарадскіх камітэтаў партыі і камсамола, на сходах партыйных і камсамольскіх ячэек горада і вёскі, дзе выказваліся прапановы па ліквідацыі недахопаў. Так, Мінскі гарадскі камітэт партыі ў кастрычніку 1933 года правёў нараду парторгаў і сакратароў цэхавых партыйных арганізацый. На пасяджэнні спецыяльнай камсамольскай секцыі яе кіраўнік, сакратар Мінскага гарадскога камітэта ЛКСМБ Галкоўскі, азнаёміў партыйных актывістаў з формамі і метадамі кіраўніцтва камсамолам. Віцебскі гарадскі камітэт партыі на пасяджэнні бюро ў кастрычніку 1933 года дэталёва разгледзеў пытанні партыйнага кіраўніцтва камсамолам на прадпрыемствах горада і ў сельскіх партыйных арганізацыях, накіраваў у шэраг з іх вопытных камуністаў. Гомельскі абласны камітэт партыі ў кастрычніку 1933 года накіраваў на камсамольскую работу 20 камуністаў, працаваўшых раней у камсамоле[2].

Прынятыя меры дазволілі палепшыць дзейнасць партыйных камітэтаў на месцах, павысіць узровень арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, актыўнасці моладзі ў палітычным жыцці.

Так, у Магілёўскай вобласці сталі рэгулярна праводзіцца сходы і пасяджэнні камітэтаў і бюро ЛКСМБ, актывізавалася работа гурткоў палітычнай вучобы, а таксама мясцовых Саветаў. Гэта адбілася і на росце прадукцыйнасці працы, асабліва ў калгасных і саўгасных брыгадах, у якіх працавалі камсамольцы, дзе яна вырасла на 18 — 20 %[3]. Вынікам карпатлівай работы па павышэнню ўзроўню партыйнага кіраўніцтва камсамолам з'явіўся далейшы рост радоў камсамола за кошт ударнікаў камсамольска-маладзёжных брыгад на Мінскім заводзе імя Варашылава, Го-

мельскім заводзе «Пралетарый», Магілёўскай швейнай фабрыцы і шэрагу іншых прадпрыемстваў.

Новыя складаныя задачы, пастаўленыя XVII з'ездам партыі, запатрабавалі паляпшэння структуры камсамольскіх органаў, павышэння іх ролі ў выхаванні моладзі. У сувязі з гэтым у сакавіку 1934 года ЦК ВЛКСМ прыняў пастанову «Аб перабудове арганізацый ВЛКСМ на падставе рашэнняў XVII з'езда партыі»[4]. Сутнасць перабудовы заключалася ва ўмацаванні арганізатарскай работы ў шырокіх масах моладзі.

Надаючы выключна важнае значэнне пытанням перабудовы дзейнасці камсамольскіх арганізацый, ЦК КП(б)Б у пастанове «Аб парткіраўніцтве і дапамозе камсамолу ў сувязі з перавыбарамі пярвічных арганізацый і перабудовай ЛКСМБ у адпаведнасці з рашэннямі IX пленума ЦК ВЛКСМ», прынятай у жніўні 1934 года, абавязаў гаркомы і райкомы, партыйныя арганізацыі аказаць неабходную дапамогу камсамольскім арганізацыям у правядзенні гэтай важнай работы [5]. Асаблівая ўвага звярталася на дзейнасць камітэтаў камсамола па выхаванню кожнага камсамольца ўсебакова развітым, ініцыятыўным, энергічным маладым чалавекам.

У наступныя гады намаганні камітэтаў і бюро камсамола рэспублікі былі накіраваны на рэалізацыю рашэнняў XV і XVI з'ездаў КП(б)Б, X і XI з'ездаў ЛКСМБ, аказанне дапамогі партыйным арганізацыям у паспяховым выкананні планаў другой пяцігодкі, камуністычнага выхавання моладзі. Пытанні кіраўніцтва камсамолам неаднаразова абмяркоўваліся партыйнымі арганізацыямі рэспублікі і ў гады трэцяй пяцігодкі. Так, у кастрычніку 1938 года Пленум ЦК КП(б)Б разгледзеў праблемы паляпшэння ўзроўню партыйнага кіраўніцтва, актывізацыі дзейнасці камуністаў, працуючых у камсамоле. У рэзалюцыі пленума адзначалася, што «дапамагчы камсамолу і, у першую чаргу, кіруючым камсамольскім кадрам павысіць свой ідэйны ўзровень і палітычную загартоўку на падставе глыбокага вывучэння гісторыі партыі — аб гэтым павінны клапаціцца партыйныя арганізацыі»[6].

Вялікую ролю ў вырашэнні гэтых пытанняў адыгралі ўказанні XVII з'езда КП(б)Б (чэрвень 1938) аб узмацненні кіраўніцтва камсамолам. З'езд падкрэсліў неабходнасць павелічэння партыйнага ядра ў камсамоле як важнай умовы камуністычнага выхавання моладзі. Праз партыйнае ядро партыя перадавала камсамольцам свой вопыт, ажыццяўляла кантроль, аказвала дапамогу і падтрымку. Выступаючы на з'ездзе, першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка ўказаў на неабходнасць «павялічыць партыйнае ядро ў камсамоле за кошт узмацнення работы па прыёму лепшых, перадавых камсамольцаў у партыю і падняць адказнасць маладых камуністаў за работу ў камсамоле»[7].

XVII з'езд КП(б)Б ускрыў наступныя недахопы ў кіраўніцтве камсамолам: аслабленая ўвага гаркомаў і райкомаў партыі да падбору камсамольскіх кадраў і кантролю за іх работай; недаацэнка прапагандысцкай работы камсамольскіх арганізацый і слабая дапамога ім з боку камуністаў; слабое кіраўніцтва сельскімі камсамольскімі арганізацыямі. Устараненне ўказаных недахопаў дазволіла вышэй падняць аўтарытэт камсамольскіх арганізацый, дзейснасць іх работы.

Па рашэнню ЦК ВЛКСМ з 15 кастрычніка 1938 да 25 студзеня 1939 года праходзілі выбары кіруючых камсамольскіх органаў. Гэта важнае мерапрыемства знаходзілася ў цэнтры ўвагі партыйных органаў рэспублікі. У лістападзе 1938 года бюро Мінскага абкома КП(б)Б заслухала сакратара Мінскага абкома ЛКСМБ аб ходзе выбараў у вобласці. Падобныя заслухоўванні ў ходзе справаздачна-выбарнай кампаніі былі праведзены ў Магілёўскай, Гомельскай, Віцебскай абласцях [8]. Гэта дазволіла на высокім ідэйна-палітычным узроўні правесці справаздачы і выбары ў камсамольскіх арганізацыях рэспублікі.

Пытанні партыйнага кіраўніцтва камсамолам атрымалі далейшае творчае развіццё ў раздзеле «Партыя і камсамол» новага Статута партыі, прынятага на XVIII з'ездзе ВКП(б)Б (сакавік 1939 года). Прапаноўвалася больш увагі ўдзяляць прыцягненню ў рады партыі лепшых прадстаўнікоў моладзі, павярнуць работу камсамола ў бок пытанняў дзяржаўнага і гаспадарчага будаўніцтва, каб у штодзённай карпатлівай рабоце камсамол вырашаў сваю галоўную задачу, якая вынікае з яго ролі як памочніка партыі. Маладзёжныя арганізацыі павінны з'яўляцца праваднікамі рашэнняў партыі, дабівацца іх няўхільнага выканання.

Рэалізуючы гэтыя рэкамендацыі, бюро Мінскага абкома КП(б)Б у кастрычніку 1939 года разгледзела пытанне «Аб партыйным кіраўніцтве камсамолам калгасных арганізацый ў Смалявіцкім раёне», дзе адзначалася, што райком партыі слаба праводзіць работу сярод камсамольцаў па прыёму лепшых з іх у свае рады. РК КП(б)Б было прапанавана якасна палепшыць работу ў камсамольскіх арганізацыях, падняць актыўнасць членаў ВЛКСМ [9]. У жніўні 1940 года Віцебскі абком КП(б)Б на пасяджэнні бюро абмеркаваў пытанне «Аб стане партыйнага кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі Гарадоцкага раёна». Бюро адзначыла недастатковы ўзровень кіраўніцтва камсамолам з боку райкома партыі, слабы рост партыйных радоў за кошт камсамольцаў. Партыйнай арганізацыі раёна было прапанавана ўзмацніць выхаваўчую работу сярод камсамольцаў, уцягваць лепшых з іх у члены ВКП(б)[10]. Гэтыя пытанні актыўна абмяркоўваліся на Магілёўскай, Палесскай, Вілейскай абласных партыйных канферэнцыях у 1940 годзе, на якіх была адзначана неабходнасць паляпшэння партыйнага кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі, больш актыўнага ўцягнення лепшых камсамольцаў у рады партыі [11].

Патрабаванні партыі знайшлі адлюстраванне ў дакументах XIV з'езда ЛКСМБ, які праходзіў у кастрычніку 1940 года. На з'ездзе шмат увагі было ўдзелена пытанням палітычнага і маральнага выхавання камсамольцаў, павышэння ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню кіруючых камсамольскіх кадраў, удасканалення работы маладзёжных арганізацый у заходніх абласцях БССР.

Камсамольскія арганізацыі рэспублікі, улічваючы складанае міжнароднае становішча, узмацнілі работу па патрыятычнаму выхаванню моладзі. Больш увагі ўдзялялася пытанням вывучэння гераічнага мінулага краіны, сумесна з камітэтамі і бюро КП(б)Б праводзіліся сустрэчы з удзельнікамі баёў у Іспаніі, ля возера Хасан, ракі Халхін-Гол, павысілася эфектыўнасць работы абаронных таварыстваў. Гэта дазволіла ўзмацніць палітычную актыўнасць камсамольцаў, што станоўча адбілася на росце колькасці членаў ЛКСМБ. Так, з 1933 па чэрвень 1941 года камсамольская арганізацыя Беларусі вырасла з 193,8 да 253,8 тыс. чалавек [12]. Гэта сведчыла аб даволі высокай дзейснасці партыйнага кіраўніцтва ЛКСМБ.

Аднак шырокаму разгортванню самадзейнасці, публічнасці, дэмакратыі ў перадваенныя гады істотна перашкаджаў культ асобы Сталіна. Метады, якія дыктаваліся перыядам барацьбы з супраціўленнем эксплуататарскіх класаў, былі механічна перанесены на перыяд мірнага сацыялістычнага будаўніцтва, калі ўмовы кардынальным чынам змяніліся. У выніку ў краіне стварылася атмасфера непатрэбнай варожасці і падазронасці. У далейшым такая палітычная практыка пашыралася і грунтавалася памылковай «тэорыяй» абвастрэння класавай барацьбы. Гэта не дазволіла камсамолу поўнасцю раскрыць свае творчыя магчымасці, нанесла істотную шкоду развіццю ініцыятывы, правільнаму падбору і расстаноўцы кадраў.

Паспяховае вырашэнне камсамолам задач сённяшняга дня немагчыма без уліку вопыту, накопленага ім у папярэднія гады, без уліку карысных ідэй і пачынанняў, памылак і пралікаў. Выступаючы на XX з'ездзе ВЛКСМ, М. С. Гарбачоў адзначыў, што «ЦК КПСС бачыць задачу партыйных арганізацый і ў тым, каб яны паўсямесна і рашуча выступалі супраць спажывецкіх адносін да моладзі, забяспечвалі клапатлівыя адносіны да працы і жыцця маладога пакалення краіны... Неабходна стварыць усе ўмовы для масавага ўдзелу моладзі ў працэсе абнаўлення і дэмакратызацыі грамадства, дапамагчы ёй авалодаць палітычнай культурай сацыялізму на практыцы»[13]. Рэалізацыя гэтых задач дазволіць камсамолу сапраўды стаць авангардам нашых юнакоў і дзяўчат, памочнікам партыі ў справе камуністычнага стварэння, перабудовы і абнаўлення савецкага грамадства.

[1] Гл.: Звязда. 1933. 2 верасня.

[2] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 164, воп. 1, спр. 170, л. 173; ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 103, воп. 2, спр. 95, л. 273; ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 376, воп. 2, спр. 125, л. 11—18.

[3] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 94, воп. 1 а, спр. 21, л. 1—4.

[4] Гл.: Комсомольская правда. 1934. 3 марта.

[5] Гл.: Чырвоная змена. 1934. 24 жн.

[6] Советская Белоруссия. 1938. 4 окт.

[7] Там жа. 25 июня.
[8] ЦПА ІМЛ. Ф. 17, воп. 21, спр. 528, л. 314—315; спр. 408, л. 48—50.
[9] Там жа. Спр. 525, л. 122—124.
[10] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 1 а, спр. 59, л. 36—42.
[11] ЦПА ІМЛ. Ф. 17, воп. 22, спр. 262, л. 419; спр. 320, л. 61—62; спр. 351, л. 90—94.
[12] Гл.: Саракавік І. А. Ленинский комсомол Белоруссии в цифрах и фактах. Минск, 1980. С. 18.
[13] XX съезд Всесоюзного Ленинского Коммунистического Союза Молодежи: Документы и материалы. М., 1987. С. 13, 22.

І. В. ЗДАНОВІЧ

# АГІТАЦЫЙНА-ПРАПАГАНДЫСЦКАЯ РАБОТА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ СЯРОД ПАРТЫЗАН У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Важным напрамкам дзейнасці Беларускага камсамола ў гады Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў была палітыка-масавая і прапагандысцкая работа сярод партызан, якая ажыццяўлялася пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, падпольных партыйных арганізацый.

Палітычная работа праводзілася з улікам канкрэтных умоў розных этапаў барацьбы. Так, у першы перыяд вайны падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі галоўную ўвагу звярталі на тое, каб умацаваць веру партызан і насельніцтва ў непазбежны разгром фашызму, уцягнуць савецкіх людзей у актыўную барацьбу.

Ва ўмовах карэннага пералому і перамаганоснага наступлення Чырвонай Арміі ў цэнтры ідэйна-палітычнай работы партыйнага і камсамольскага падполля аказалася мабілізацыя народных мас на аказанне ўсебаковай дапамогі савецкім войскам для хутчэйшага разгрому ворага і выгнання яго з нашай зямлі. Перад партызанскім рухам Беларусі ў той перыяд паўстала найважнейшая задача — выратаванне насельніцтва ад знішчэння і прымусовага вывазу ў германскае рабства, а таксама захаванне народнай маёмасці ад рабавання акупантамі. Вялікае значэнне ў гэты перыяд набыла дзейнасць партыйных і камсамольскіх органаў па растлумачэнню партызанам і насельніцтву неабходнасці захавання ўраджаю ад захопнікаў.

Састаўной часткай ідэйна-палітычнай работы партыйных і камсамольскіх арганізацый як у пачатку вайны, так і ў наступны перыяд было развенчванне ілжывай фашысцкай прапаганды. Праводзячы вялікую агітацыйную работу ў масах, партыя і камсамол гаварылі народу ўсю праўду, растлумачвалі сапраўдную сутнасць каварных планаў гітлераўскіх захопнікаў. Пры рашэнні гэтых задач выкарыстоўваліся розныя формы і метады палітычнага ўздзеяння: індывідуальныя і калектыўныя гутаркі, лекцыі, даклады, мітынгі, выпуск газет і «баявых лісткоў», праслухоўванне савецкіх радыёперадач, канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Эфектыўнай формай ідэйна-палітычнай работы Ленінскага камсамола Беларусі ў тыле ворага з'яўлялася вусная прапаганда і агітацыя. У 1942 годзе асноўная маса камсамольскіх прапагандыстаў і агітатараў аб'ядноўваецца ў агіткалектывы. У 1943 — 1944 гадах колькасць агітатараў і прапагандыстаў, агітацыйна-прапагандысцкіх груп значна павялічылася. Так, у Баранавіцкай вобласці ў 1943 годзе агітацыйную работу сярод партызан вялі звыш 100 прапагандысцкіх груп, а ў Мінскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях працавала звыш 5,7 тыс. маладых агітатараў [1].

Аналіз тэматыкі гутарак, лекцый і дакладаў паказвае, што яны ахоплівалі вялікае кола пытанняў: «Айчынная вайна савецкага народа», «Пра бягучы момант», «Вераломнае нападзенне фашысцкай Германіі на СССР», «Ход сучаснай вайны», «Міжнароднае становішча, што склалася ў ходзе сучаснай вайны», «Чаму непазбежны крах гітлераўскай Германіі?» і г. д.

Важным напрамкам ідэйна-палітычнай работы партыі і камсамола з'яўлялася дакладнае прапагандысцкае асвятленне поспехаў Чырвонай Арміі, яе перамог пад Масквой, Сталінградам, на Курскай дузе.

Нямала гутарак прысвячалася гераічнай барацьбе партызан і падпольшчыкаў. Вось некаторыя з іх: «Гісторыя зараджэння і развіцця пар-